# СЦВЯРДЖЭННІ АБ БУДУЧЫМ ХАРЧОВЫМ ДЭФІЦЫЦЕ СЯРГЕЙ ЛІНГ ЛІЧЫЦЬ НАДУМАНЫМІ

Дэфіцыту прадуктаў у Беларусі не будзе, заявіў прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь С.С.Лінг 27 жніўня пасля наведвання калгаса «Ленінскі шлях» Слуцкага раёна. Сапраўды, працяглая засуха прывяла ў краіне да недабору неабходнай колькасці кармоў. Аднак вымушанага скарачэння грамадскага пагалоўя жывёлы, аб чым паведамляюць некаторыя сродкі масавай інфармацыі, урад не дапусціць. Будуць прыняты меры па перамяшчэнню жывёлы ў тыя гаспадаркі, дзе забяспечаць іх належнае ўтрыманне і давядзенне да патрэбных кандыцый.

Як паведаміў прэс-сакратар прэм'ер-міністра Іван Знаткевіч, у пятніцу кіраўнік урада пабываў таксама на шэрагу гандлёва-вытворчых прадпрыемстваў Слуцка і Салігорска. Сяргей Лінг падкрэсліў, што на сёлетнюю зіму аб'ёмы закладкі асноўных відаў харчавання перавысяць мінулагоднія, таму падстаў для ажыятажнага попыту на іх быць не павінна.

Вывучаючы арганізацыю кірмашоў па продажы тавараў для школьнікаў, кіраўнік урада пацвердзіў, што ўрад і ў далейшым будзе прад'яўляць строгія патрабаванні за належную падрыхтоўку да новага навучальнага года.

У рабочай паездцы Сяргея Лінга суправаджаў старшыня Мінскага аблвыканкама Мікалай Дамашкевіч.

**БЕЛТА.**